З ЛЕТАПІСУ ВЯЛІКАГА ЖЫЦЦЯ

# ПЕРШАЯ ССЫЛКА

У паліцэйскім участку пасля універсітэцкіх падзей Уладзіміра Ульянава трымалі некалькі дзён.

Аднойчы яго выклікалі. Тоўсты жандар, які нагадваў вялізнага ката ў ботах, сказаў:

— З Казані высылаецеся, малады чалавек, — і паўтарыў больш цвёрда: — Высылаецеся! У Какушкіна. Так-с. Павінны быць удзячны ўладам. На мой погляд — у Сібір вас, бунтаўшчыкоў. Там ваша месца.

Жандар адвярнуўся, тым самым даў зразумець — размова скончана.

Разам з Уладзімірам Ульянавым высылаліся ў розныя куткі Расійскай імперыі ўсе актыўныя ўдзельнікі студэнцкай сходкі.

У дзень ад'езду сярод казанскіх жыхароў была распаўсюджана лістоўка. У яе напісанні, відаць, прымаў удзел і Уладзімір Ульянаў. Праўда, ніякіх дакументальных сведчанняў аб гэтым не захавалася, але той факт, што Уладзімір Ульянаў быў адным з кіраўнікоў сходкі, дае падставы для такіх меркаванняў. Лістоўка была выдадзена ад імя ўсіх выключаных з універсітэта студэнтаў.

Я трымаю ў руках пажоўклы ад часу лісток і нібы бачу перад сабою тых няскораных 18—20-гадовых юнакоў, якія мужна ўзнялі свой голас у абарону справядлівасці.

«Бывай, Казань!... Бывай, універсітэт!.. Недалёка яшчэ той час, калі мы прыязджалі сюды, поўныя мары і любві да універсітэта і яго жыцця, мы думалі, што тут, у храме навукі, мы знойдзем тыя веды, абапіраючыся на якія змаглі б увайсці ў жыццё змагарамі за шчасце і дабро нашай спакутаванай Радзімы!

Мы заўзята шукалі гэтых ведаў!.. Але з чым мы сутыкнуліся тут?.. Насустрач нам ішла тая «навука для навукі», якую так горача абаранялі некаторыя з паноў прафесараў на сходцы, дзякуючы якой, гаварылі яны, мы, студэнты, маглі б спакойна і абыякава глядзець на прыгнёт і пакуты дарагой Радзімы...

Жудасна і холадна зрабілася нам... Наша маладая кроў, наша маладое сэрца прымусіла шукаць выйсця...

Мы павінны былі пратэставаць, і наш пратэст атрымаў актыўную форму — сходку... За наш пратэст нас выключаюць з універсітэта і выганяюць з Казані!!!

Мы ад'язджаем з Казані з глыбокай упэўненасцю ў праўдзе нашай справы!

Паціскаем рукі тым, хто кахае нас!!!»

Раніцай 7-га снежня 1887 года ля дома Салаўёвай, што знаходзіўся на вуліцы Нова-Камісарыеўскай, спынілася кібітка. Забразгацела брамка. Паказаліся Ульянавы. Уладзімір Ільіч развітваецца з Оляй, Міцяй і разам з маці і Маняшай накіроўваецца да кібіткі.

Рамізнік нацягвае лейцы:

— Но! Пайшлі, радзімыя!

Сытыя коні ірванулі і панесліся па пустэльных вуліцах Казані.

Пазней Марыя Ільінічна ўспамінала:

«Гэта быў першы выпадак, калі я нагледала рэпрэсію паліцыі... З братам і маці, якая паехала праводзіць Уладзіміра Ільіча, мы едзем па горадзе ў крытай кібітцы, а ззаду нас на рысаку суправаджае — і гэта спыняе ўсю маю ўвагу — паліцэйскі чын. За горадам ён паварочвае назад, а мы... працягваем наша падарожжа».

Ад Казані да Какушкіна 40 кіламетраў. Не такая ўжо вялікая адлегласць. Зараз камфартабельны аўтобус давязе нас за якуюсьці там няпоўную гадзіну. А ў той час на конях трэба было патраціць амаль цэлы зімовы дзень.

Бясконца цягнецца дарога, маўклівая, аднастайная. Калі-нікалі сустрэнецца вёска — чорныя прысадзістыя хаткі пахмурна, нібы са здзіўленнем, глядзяць невялічкімі акенцамі-вачыма на кібітку. Мясціны падарожнікам знаёмыя: колькі разоў Ульянавы ўсёй сям'ёй ездзілі адпачываць у Какушкіна ў летнія месяцы вось гэтай дарогай.

У кутку кібіткі задуменна сядзіць былы студэнт Казанскага імператарскага універсітэта, а цяпер ссыльны Уладзімір Ульянаў.

«Ссыльны», — паўтарае пра сябе Уладзімір Ільіч і зноў задумваецца. Удзел у студэнцкіх хваляваннях — толькі пачатак, толькі першы крок — гэта вядома. Наперадзе — барацьба, цяжкая барацьба з царызмам.

Уладзімір Ільіч глядзіць у невялічкае акенца і не заўважае, як пільна сочыць за ім маці. Яе сын вельмі змяніўся. Пасталеў. Выраз твару нейкі сур'ёзны і заклапочаны.

І яна адчувае — Валодзя думае пра лёс, пра свой далейшы шлях. Зараз ён вельмі падобны на Сашу, калі той выступаў з прамовай на судзе. Нібы здалёк да яе даносяцца словы Сашы:

«—...Пасля вывучэння грамадскіх і эканамічных навук... перакананасць у ненармальнасці існуючага ладу ва мне ўзмацнілася, і невыразныя мары пра свабоду, роўнасць і братэрства набылі строга навуковыя і іменна сацыялістычныя формы. Я зразумеў, што змяненне грамадскага ладу не толькі магчыма, але нават непазбежна».

Дзеці! Кожнаму з вас маці аддае сваё сэрца. Таму і баліць яно за кожнага...

Толькі вечарам, калі амаль сцямнела, Ульянавы дабраліся ў Какушкіна. На ганку старога флігеля іх сустракала Анна Ільінічна. Па «справе» Аляксандра Ільіча Ульянава царскі суд прыгаварыў Анну Ільінічну да ссылкі ў Сібір тэрмінам на 5 год. Марыі Аляксандраўне давялося доўга хадайнічаць, пакуль Сібір была заменена Какушкіным.

**Павел ТКАЧОЎ**

Некалі Какушкіна належала бацьку Марыі Аляксандраўны — Аляксандру Дзмітрыевічу Бланку. Пасля яго смерці стары дом на беразе рэчкі Ушні і флігель перайшлі ва ўладанне пяці дачок Бланка.

«Валодзя пасяліўся ў флігелі, заняўшы вуглавы пакойчык, вокны якога выходзілі на поўнач. У суседнім, паўднёвым пакойчыку жыла Анна Ільінічна.

У пакойчыку Валодзі было вельмі простае абсталяванне: драўляны ложак, на сцяне палічка з кнігамі, простая шафа, два-тры крэслы... стол. Тут жа ля дзвярэй — цяслярны варштат...

Валодзя жыў адасоблена, праводзячы амаль увесь час за кнігамі».

Гэта ўспамінае стрыечны брат Уладзіміра Ільіча Мікалай Іванавіч Вераценнікаў.

Пазней, у час размовы з В. В. Вароўскім Уладзімір Ільіч расказваў: «Здаецца, ніколі потым у маім жыцці, нават у турме ў Пецярбургу і ў Сібіры, я не чытаў столькі, як у год пасля маёй высылкі ў вёску з Казані. Гэта было чытанне запоем з ранку да позняга часу».

Сярод прачытаных кніг — творы Чарнышэўскага, Бялінскага, Дабралюбава, Някрасава і іншых аўтараў. Асабліва Уладзімір Ільіч любіў творы Чарнышэўскага. Неаднойчы потым ён падкрэсліваў:

— Вось гэта сапраўдная літаратура, якая вучыць, вядзе, натхняе. Я раман «Что делать?» перачытаў за адно лета (1888 г.) разоў пяць, знаходзячы ў гэтым творы ўсё новыя хвалюючыя думкі...

Далёка за поўнач гарыць агеньчык у пакоі Уладзіміра Ульянава.

— А божухна-матухна, і калі толькі чалавек адпачывае? — гавораць адзін аднаму сяляне...

А ён, схіліўшыся над сталом, чытае, запісвае ў сшытак... Прыблізна ў гэты час дырэктар дэпартамента паліцыі загадвае начальніку казанскага губернскага ўпраўлення:

«...Распарадзіцеся... устанавіць строгі нягласны нагляд за высланым у вёску Какушкіна Лаішэўскага павета Уладзімірам Ульянавым».

У сваю чаргу казанскі губернатар дае загад лаішэўскаму павятоваму спраўніку:

«...прадпісваю Вашаму Высокаблагародзію адразу ж, пасля атрымання гэтага, устанавіць найстражэйшы сакрэтны нагляд за... Ульянавым».

У музеі У. І. Леніна ў Маскве экспануецца даволі цікавая рэч. На вокладцы прыгожым почыркам напісана: «Сакрэтная кніга». Яе старонкі запоўнены прозвішчамі людзей, якіх царскі ўрад лічыў палітычна ненадзейнымі. У раздзеле «1888 год» чытаем:

«Ульянаў Уладзімір Ільіч; студэнт Казанскага універсітэта юрыдычнага факультэта. Выключан з універсітэта. Распараджэннем кабінета міністраў ад 19 жніўня 1888 года яму нягласна закрыт доступ на дзяржаўную службу».

Такія кнігі знаходзіліся ва ўсіх дзяржаўных установах царскай Расіі. І ў кожнай з іх у 1888 годзе з'явілася новае прозвішча — Ульянаў. Паліцыя пільна сачыла за Уладзімірам Ільічом і Аннай Ільінічнай. Вось некалькі радкоў з успамінаў старых какушкінскіх калгаснікаў.

«Як выдалілі Ульянавых з горада Казані, моцна ўзялі іх пад нагляд паліцыі. І наязджала начальства на агляд, што Ульянавы тут ці няма. І баяліся іх, вельмі баяліся, як агню.

Часам сотнік ці ўраднік пытае:

— Уладзімір Ільіч або Анна Ільінічна Ульянавы вас не наведваюць?.. З вамі размоў не вядуць? Вам чаго-небудзь не прапануюць?

Але ж хіба селянін, паважаючы Ульянавых, яму, сотніку, што-небудзь скажа?

Адказваем яму:

— Нічога не ведаем: дзе яны і ці тут яны.

Пацярэбіць ураднік свае вусы і пойдзе ні з чым з Какушкіна.

Часта, вельмі часта наведвалі паліцэйскія чыны Ульянавых. З аднаго з іх — станавога прыстава, даволі тупога, як і ўсе паліцэйскія чыноўнікі, — Анна Ільінічна, любіла пакпіць. Вось ён увальваецца ў пакой:

— У-у-ух!.. Дзень добры ў хату!

— Добры дзень, пан прыстаў. Як даехалі? — пытаецца Анна Ільінічна.

— Дзякуй богу, — добра. Коні нішто сабе, даімчалі хутка.

— А чаму спяшаліся?

— Служба-с, пані Ульянава, служба-с. Мы гасудара-імператара салдаты! Так-с! А дзе пан Ульянаў? Нешта не відаць?

— Збег...

— К-к-куды? Хутчэй гаварыце?!

— Збег ён, пан прыстаў, — спакойна адказвае Анна Ільінічна і робіць паўзу... — У поле... Вунь, бачыце, на лыжах!

— У-ух! Ажно ўспацеў. Гэта ж трэба — так сэрца калоціцца! З Какушкіна ні вам, пані Ульянава, ні вашаму брату адлучацца няможна. Так-с, няможна.

— І ў той гай, што за гумном, прайсці нельга?

— Не, чаму жа-с, можна, але не далей пятнаццаці вёрст. Так-с.

— Ну, а калі я зайду або заеду далей за шаснаццаць вёрст, тады што?

— Арышт-с! Так-с, пані, арышт-с.

Анна Ільінічна смяецца.

— Вам бы ўсё смяяцца. Арышт-с, вось тэк-с».

Так міналі дні за днямі. 9 мая 1888 года Уладзімір Ульянаў падае прашэнне на імя міністра народнай асветы з просьбай дазволіць яму зноў паступіць у Казанскі універсітэт. Адказ прыйшоў толькі 8 ліпеня: «Ад дэпартамента Народнай Асветы па загаду Яго Высокаправасхадзіцельства Пана Міністра Народнай Асветы на прашэнне былога студэнта Імператарскага Казанскага універсітэта Уладзіміра Ульянава аб дазволе яму паступіць у лік студэнтаў названага універсітэта, аб'яўляецца, што Пан Міністр меў ласку выкладзенае хадайніцтва прасіцеля адхіліць.

Віцэ-дырэктар Эзаў.
Справавод Ма».

«...Адхіліць». Такія ж адказы атрымлівала і маці Уладзіміра Ільіча — Марыя Аляксандраўна, якая таксама падавала прашэнні на імя дэпартамента паліцыі і міністра народнай асветы.

6 верасня 1888 года Уладзімір Ульянаў падаў прашэнне на імя міністра ўнутраных спраў, каб яму для атрымання адукацыі дазволілі выехаць за мяжу.

На гэтым прашэнні зноў тая ж рэзалюцыя: «Адхіліць».

Восенню 1888 года Уладзімір Ільіч атрымаў дазвол перасяліцца з Какушкіна ў Казань. У Казані ён пачынае сур'ёзна вывучаць «Капітал» Карла Маркса, творы Энгельса, удзельнічае ў тайных гуртках. Таварыш Уладзіміра па сімбірскай гімназіі Андрэеў пазней успамінаў:

«Быў зімовы вечар. Некалькі студэнтаў сабраліся ў Валодзевым пакоі. Пры святле газавай лямпы ён прачытаў нам свой рэферат аб становішчы сялянства ў царскай Расіі. Вядома, узнікла спрэчка, і памятаю, як Валодзя горача даводзіў:

— Трэба глыбей удумвацца ў існуючае зло! Трэба зразумець прычыны няроўнасці!.. А для гэтага неабходна перш за ўсё чытаць і чытаць... Вось што патрэбна! Вось чаго нам усім не хапае!..

Ён стаяў побач з лямпай у цёмным пінжаку, на якім моцна вызначаўся белы адкладны каўнер кашулі. Святло лямпы, якое прабівалася знізу, надавала яго мужным і высакародным рысам асаблівую выразнасць, яго праніклівыя карыя вочы часам ўспыхвалі, быццам агонь асвятляў іх з сярэдзіны.

Была глухая ноч. У доміку Ульянавых усе спалі, але мы, таварышы Валодзі, не разыходзіліся. Нечакана недзе ўдалечыні на вуліцы пачуўся праразлівы свісток паліцэйскага.

Валодзя змоўк, прыслухаўся і пагасіў лямпу.

— Пойдзем, — сказаў ён, — трэба па дамах...

— Але ж ты не дагаварыў, — запярэчылі мы. — Пасядзім яшчэ крыху...

— Не. Трэба разыходзіцца. Сустрэнемся праз тыдзень у іншым месцы! — рашуча заявіў Валодзя і праводзіў нас да брамкі. Развітваючыся, ён ветліва сказаў:

— Паверце мне, так будзе лепш! Няма чаго дарэмна сабак злаваць».

У той час у Казані працаваў адзін з лепшых распаўсюджвальнікаў марксізма ў Расіі Мікалай Яўграфавіч Федасееў.

Пазней Уладзімір Ільіч Ленін напіша пранікнёны артыкул аб гэтым выдатным рэвалюцыянеры-марксісце.

Але сустрэцца ім не давялося.

«Летам 1889 года ў Казані быў арыштаваны гурток Федасеева, і Уладзімір Ільіч гаварыў мне, — успамінала Анна Ільінічна Ульянава, — што, затрымайся ён у Казані, ён таксама быў бы арыштаваны таму, што быў знаёмы з некаторымі арыштаванымі, хоць асабіста Федасеева не ведаў..

Гэта дало магчымасць Уладзіміру Ільічу мірна займацца ў Самары тэарэтычнай працай па вывучэнню марксізма, прапагандай яго сярод маладой самарскай публікі, а таксама атрымаць дазвол на здачу экзаменаў экстэрнам, аб чым шмат хадайнічала маці».

Самарскі перыяд — новая старонка ў жыцці Уладзіміра Ільіча Леніна.



## СТАРОНКІ УНІВЕРСІТЭЦКАЙ ЛЕНІНІЯНЫ

● Шмат студэнтаў — выпускнікоў факультэта журналістыкі, рыхтуючыся дастойна сустрэць 100-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна, напісалі дыпломныя работы па ленінскай тэматыцы.

Некалькі дзён назад Л. Марцінкевіч паспяхова абараніла дыпломную работу на тэму «Публіцыстыка У. І. Леніна ў 1917 годзе». Навуковы кіраўнік М. С. Зярніцкі і рэцэнзент Р. В. Булацкі станоўча ацанілі працу выпускніцы.

● У гонар ленінскага юбілею ў актавай зале галоўнага корпуса быў наладжан сістэматычны прагляд фільмаў аб Леніне.

Днямі студэнты прагледзелі фільмы «Ленін у Самары», «Ільіч у Лондане», «Уладзімір Ульянаў».

● Супрацоўнікі бібліятэкі ў галоўным корпусе падрыхтавалі выстаўку твораў правадыра, якія былі выдадзены да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча.

Вялікую цікавасць выклікала і выстаўка твораў, якія былі выдадзены пры жыцці У. І. Леніна і цяпер маюцца ў кніжным фондзе БДУ. Сярод іх «Ленін аб кааперацыі», «Імперыялізм як вышэйшая стадыя капіталізму», «Дзіцячая хвароба «левізны» ў камунізме».

● На факультэце журналістыкі прайшла двухдзённая навуковая канферэнцыя, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

*Практычныя заняткі з другакурснікамі хімфака вядзе старшы выкладчык Л. М. Аўсянка.*

Фота **М. Нечыпарэнкі.**



# ЦЯЖКА Ў ВУЧОБЕ—ЛЁГКА НА ЭКЗАМЕНЕ

Каб найбольш поўна вывучыць сучасную мову, філолагі павінны ведаць і гісторыю яе развіцця. У першым семестры для трэцякурснікаў пачалі чытаць курс лекцый па гісторыі беларускай мовы. Адначасова праводзіліся і практычныя заняткі.

Мы пабывалі на такіх занятках у першай групе беларускага аддзялення. Праводзіць іх асістэнт кафедры беларускай мовы Іна Афанасьеўна Каралёва.

Тэма — «Сінтаксічны разбор сказаў у Смаленскай грамаце». Студэнт Уладзімір Гураль коратка спыніўся на тым, якое дачыненне маюць смаленскія гаворкі да беларускіх. Георгій Галоўчыц, Анатоль Бруцкі расказалі аб гісторыі ўзнікнення і характарыстыцы сінтаксісу Смаленскай граматы. Іх адказы дапоўнілі Валя Булат і Шура Боханчык.

Потым Іна Афанасьеўна абагульніла адказы, і студэнты прыступілі да разбору тэкстаў, карыстаючыся хрэстаматыяй старажытнай беларускай мовы. Адначасова высвятляліся пытанні адрознення сучаснага сінтаксісу ад старажытнага. Добра падрыхтаванымі па гэтых пытаннях паказалі сябе Лена Доста, Дзіна Вальская і іншыя. Выкладчыца задаволена.

— Веды трывалыя, — кажа Іна Афанасьеўна, — і, думаецца, на экзаменах студэнты групы атрымаюць толькі добрыя і выдатныя адзнакі. Немалую ролю адыгрывае і агульная цікавасць да прадмета. Студэнты задаюць многа пытанняў, імкнуцца глыбей засвоіць матэрыял, а таму і наведваюць практычныя заняткі ахвотна.

— Цяжка ў вучобе — лёгка на экзамене, — жартуе Мікола Грабянёк. — Падрыхтаванаму сесія — адно задавальненне.

Хочацца пажадаць, каб сапраўды было так, каб Марыі Андрэеўне Жыдовіч, якая чытала трэцякурснікам курс лекцый па гэтаму прадмету, і Іне Афанасьеўне Каралёвай не даводзілася ставіць адзнакі з часціцай «не».

**Я. РУДЗЯНСКІ,**
**студэнт.**

# ГЭТА ПАЧЫНАЛАСЯ ТАК...

*Г. РЫЛЮК, нам. сакратара парткома*

У сакавіку 1963 года ва ўсіх карпусах Беларускага дзяржаўнага універсітэта з'явілася аб'ява наступнага зместу:

«Друг! Калі ты моцны душой і целам, давай на цаліну! Кацёл агульны. Камфорта не абяцаем, але работы, сонца і вяселля — удосталь.

Камітэт камсамола.

Штаб працоўных спраў».

Менавіта з гэтай аб'явы і пачалося фарміраванне першых студэнцкіх будаўнічых атрадаў. 290 студэнтаў, смелых душой і моцных целам, што адмовіліся адпачываць, паехалі ў казахстанскія стэпы, каб дапамагчы калгасам і саўгасам Уральскай вобласці ў будаўніцтве розных аб'ектаў.

Начальнікам штаба будаўнічага атрада быў студэнт трэцяга курса гістфака Канстанцін Сучкоў, а камісарам Валодзя Лаўрукові́ч.

Мне ўспамінаецца такі выпадак, калі студэнтка IV курса матэматычнага факультэта Радзішэўская са слязьмі на вачах прыйшла ў камітэт камсамола прасіць, каб яе ўзялі на цаліну. (Дарэчы, дзяўчат у першыя атрады бралі ў самай абмежаванай колькасці).

Я ёй кажу, што на цаліне будзе цяжка, што гэта паўпустынныя мясціны, што дзяўчатам вытрымаць тыя ўмовы вельмі складана. А яна адказвае: «Усе мяне хочуць запалохаць цяжкасцямі. А я іх яшчэ не бачыла і пры такім недавер'і і не пабачу. А мне хочацца праверыць сябе на цяжкасцях».

І трэба аддаць ёй належнае. Радзішэўская была першай на цаліне.

З думкамі праверыць сябе ў цяжкасцях ехалі многія. На развітанне яны гаварылі: «Студэнт не павінен жыць толькі кніжкамі, экзаменамі, адзнакамі. Усё гэта не павінна засланяць ад нас жыцця краіны».

Пасланцы нашага універсітэта паспяхова справіліся са сваёй задачай. У вялізных аўдыторыях яго расла, мужнела і атрымлівала дыплом будаўніка цэлая плеяда цудоўных хлопцаў і дзяўчат. На два месяцы іх аўдыторыямі былі будаўнічыя пляцоўкі саўгасаў «Пермскі», «Фрунзенскі», «Чапаеўскі», «Стэпавы» і «Ульянаўскі».

Не кожнаму да гэтага даводзілася спрабаваць на смак кроплю свайго поту. Праца згуртавала іх у адзіную, моцную сям'ю.

Студэнцкім атрадам універсітэта было асвоена каля 300 тысяч рублёў капіталаўкладанняў, пабудаваны тры школы, уведзены ў эксплуатацыю бальніца, 11 жыллёвых дамоў, 10 вытворчых памяшканняў. Усе работы выкананы з ацэнкай «добра». Такі працоўны вынік першага студэнцкага будаўнічага атрада БДУ.

На цаліне было нялёгка. Вельмі красамоўна сведчыць аб гэтым пісьмо аднаго з нашых студэнтаў, дасланае ў камітэт камсамола: «Дарагія сябры, вось ужо мы цэлы месяц на цаліне, накапілася мноства ўражанняў, шмат новага. Ёсць і цяжкасці, і свае радасці. Лёгкага жыцця нам ніхто не абяцаў. Тут ні мяккага ложка, ні асфальтаваных вуліц, ні тралейбусаў, ні тэатраў. Але тут ёсць вясёлы і ніколі не сумуючы студэнцкі народ, які замяняе ўсё. І нічога, што ўставаць даводзіцца ў 6 гадзін, што працуем па 10 гадзін, што ядзім кашу, якая, можа, табе і не падабаецца, што выхадныя — праз два тыдні. Часта баліць спіна ад стомленасці, ныюць рукі. Але якой радасцю і гордасцю напаўняецца сэрца, калі ў стэпе ўбачыш белыя домікі, пабудаваныя табою, тваімі сябрамі».

Кожны з цаліннікаў працаваў з уздымам, з запалам. На самай справе па 12—14 гадзін у суткі, пад спякотным казахстанскім сонцам. І ніхто не прымушаў працаваць па столькі гадзін, але яны самі...

Прыемныя ўспаміны пакінулі студэнты пасля сябе ў мясцовых жыхароў. Хочацца прывесці радкі з пісьма, якое прыслалі ў «Комсомольскую правду» вучні школы саўгаса «Стэпавы» Уральскай вобласці. Яно было надрукавана 9 кастрычніка 1963 года.

«Дабравольцы з Беларускага дзяржаўнага універсітэта многа ўвагі ўдзялялі нам, школьнікам, летам. Студэнты Ткачоў, Едчык, Бяляўцаў займаліся з намі на спартыўных пляцоўках, вучылі іграць у баскетбол, валейбол. Падарылі нам кнігі. Студэнткі Сысун, Цімошак, Ісаеня разам з нашай піянерважатай правялі зборы ў атрадах. Выкладчык універсітэта У. І. Лаўруковіч правёў у нас гутарку «Навіны сучаснай радыётэхнічнай фізікі». А як удзячны мы пасланцам універсітэта за семінары, праведзеныя для камсамольскага актыву школы.

По даручэнню вучняў
сакратар камсамольскай арганізацыі
ЖУНСАЕВА.

Саўгас «Стэпавы»
Уральскай вобласці».

Многа такіх слоў можна яшчэ сказаць пра нашых цаліннікаў. Пабываўшы на цаліне, яны ўбачылі зямлю супярэчлівую, цяжкую, але бясконца гераічную. У кожнага са студэнтаў з'явілася павага да працоўнага чалавека, які не два месяцы, а многія гады мужна пераносіць цяжкасці, будуе новыя гарады, вырошчвае хлеб. Студэнты лепш пазналі адзін другога. На цаліну яны ехалі проста як студэнты адной установы, а вярталіся самымі блізкімі сябрамі. З той пары слова «цаліннік» стала пасапраўднаму родным.

Вельмі яскрава пацвярджаюць гэта словы песні, напісанай студэнтам філфака для ўдзельнікаў першага будаўнічага атрада БДУ:

И останутся в сердце
Казахстанские степи,
Комсомольские стройки,
Целина, целина!

Гэта песня стала гімнам цаліннікаў.

Кожны год, калі студэнты ад'язджаюць на цаліну, я праводжу іх і з радасцю сустракаю ў верасне́ўскія дні, калі вяртаюцца яны ў сцены роднага універсітэта, успамінаючы пры гэтым многіх маіх добрых сяброў, камсамольцаў, актыўных удзельнікаў першых атрадаў.

# ЁСЦЬ ДЗЕ ПРЫКЛАСЦІ РУКІ

**Гаворачы аб падрыхтоўцы да новага працоўнага семестра, нельга не ўспомніць тыя добрыя справы, якія былі зроблены будаўнічымі атрадамі ў 1968 годзе.**

**Мінулым летам у Беларусі, Казахстане і Эстоніі, Мурманску і Нарыльску, у ГДР працавалі 52 студэнцкія атрады БДУ.**

**Медалямі «За асваенне цалінных зямель» былі ўзнагароджаны А. Каленік, А. Канаплянік, В. Бражнікаў, А. Кажэўнікаў, Г. Куцьіна, П. Бондар, Б. Буляк, А. Карчашка.**

**Было пабудавана 83 аб'екты, асвоена капіталаўкладанняў на 1.347 тысяч рублёў.**

**У сёлетнім працоўным семестры студэнты БДУ будуць працаваць у Брэсцкай, Магілёўскай, Гомельскай і Мінскай абласцях. Сярод укамплектаваных атрадаў ёсць і адзін жаночы. Дзяўчаты з матфака хочуць пераканаць скептыкаў, што яны могуць працаваць не горш за хлопцаў. Абласное упраўленне мясцовай прамысловасці пайшло насустрач жаданню студэнтак і прапанавала ім працаваць на цагельным заводзе.**

**Ёсць яшчэ адзін цікавы атрад з БДУ, месца дыслакацыі якога—Палессе. У склад яго ўваходзяць будучыя геолагі.**

**Ужо некалькі гадоў паміж Ленінградскім караблебудаўнічым інстытутам і энергафакам БПІ адбываецца абмен будаўнічымі атрадамі. Гэта стала традыцыяй. Нядрэнна было б знайсці такіх сяброў і нашаму універсітэту.**

**Дагаворная кампанія заканчваецца. Хутка будуць падведзены вынікі. А потым пачнецца другі этап падрыхтоўчага перыяду — вучоба камандзіраў па тэхніцы бяспекі.**

**Прэс-група.**



**З сонечнымі вясеннімі днямі да нас прыходзіць сесія. А за ёй пачынаюцца канікулы—пара адпачынку. Але верныя сваім лепшым традыцыям юнакі і дзяўчаты з універсітэта не прывыклі ляжаць на сонцапёку, калі Радзіме так патрэбны іх моцныя маладыя рукі. У гэтым годзе свой трэці, працоўны семестр у гонар ленінскага юбілею яны аб'явілі ўдарным. Лета будзе як ніколі гарачым. І яго подых ужо даўно адчуваецца.**

**У сённяшнім нумары нашай газеты на 3-й і 4-й старонках мы расказваем аб той асаблівай працоўнай рамантыцы, якая штогод вабіць і кліча нашу няўрымслівую моладзь.**

# ДВОЕ Ў СТЭПЕ

Усталёўваецца цішыня. Хлопцы чакаюць, пакуль разгарыцца вогнішча...

— Генка, давай што-небудзь беларускае, — просяць Стрыжэвіча.

Гена бярэ баян. Прыносіць гітару Павел Марчанка. Удваіх настройваюцца, а пасля ў стэпе чуваць музыка. Пачынае спяваць Тамара. Пераліваецца яе чысты голас, і стэпавы вецер нясе яго за Урал, у вёску, дзе жывуць казахі...

Сёння дзень нараджэння Галі Дзядзюлі. Раніцою ёй даручылі падняць сцяг, а вечарам атрад вырашыў адзначыць свята песнямі.

Скончылася адна, а на змену ёй загучала новая. У цемнаце відаць нейкая постаць.

— А-а, гэта дзед Пілі́п ідзе да нас.

Дзед Пілі́п родам з Украіны, але і яму на старасці захацелася «рамантыкі» — прыехаў будаваць дамы ў Казахстане. Дзед любіць танцаваць.

— Дай, Гена, «рускага» ці «яблычка», — папросіць, бывае, Гену Стрыжэвіча і так вытанцоўвае, дзе і сілы бяруцца.

Абыйдзе ён вакол вогнішча, убачыць Тамару і запрашае ў круг. А яна закіне галаву, зробіць выхад і, як бы спаборнічаючы з дзедам, танцуе.

А хлопцы? О-о, хлопцы ёсць хлопцы! Яны падбадзёрваюць дзяўчыну:

— Давай, давай, Тома, не падвядзі!

Дзед здаецца.

— Вы, дзеткі, людзі дзяржаўныя, а я вам не раўня, — звычайна кажа ён і выходзіць з круга.

А Тамара яшчэ доўга весяліць сяброў з атрада «Нёман». Любяць яе тут.

Ужо даўно за поўнач. Хутка раніца. Яшчэ гадзінадзве, і ўзыйдзе сонца. Вы не бачылі, як яно ўзыходзіць у Казахстане?

...На лінейку лавары не станавіліся. А сёння выключэнне. Камандзір атрада Уладзімір Карпаў выказвае падзяку Тамары Дударчык і Лілі Карпавай. Дзяўчатам уручаюцца граматы. Хлопцы віншуюць іх.

...На беразе возера двое. Не спіцца ім. Я пазнаў голас Тамары. А хто з ёй — здагадаўся: Гена Фядотаў. Дзяўчына скончыла песню, а хлопец доўга стаяў у маўчанні — не хацеў парушаць цішыню.

Падымаўся і рассейваўся туман. Час ад часу чуліся ўсплескі вады.

— Ужо раніца, — кажа Тамара, — пайшлі.

— Давай паглядзім, як сустракаюць раніцу качкі,— адказвае хлопец.

Дзікія птушкі доўга ныралі, а пасля падняліся ўгору, пакінуўшы срэбныя кругі на азёрнай гладзі.

У напрамку да студэнцкага лагера ішлі двое...

Х. АЛЯКСАНДРАЎ.

Генадзь ПАШКОЎ

# ХЛЕБ ПРЫЙШОЎ

*Гэй! Хлеб прыйшоў,*
*Гані, брат, транспарцёры,—*
*Швартуйце баржу.*
*К прыстані хутчэй! —*
*Брыгадзір галёкае*
*бадзёры,—*
*Ну, што стаіш?*
*Давай, браток, ямчэй!*
*Прaцягнуць рукі*
*транспарцёры важна,*
*Захлопаюць разважліва:*
*джу, джу,*
*І падае пшаніца на дно*
*баржы,*
*Як залатыя кропелькі*
*дажджу.*

* * *

*На лоб спаўзае шапка,*
*Чарнявы чуб змакрэў,*
*Піла зубамі шаркае*
*У звонкіх кронах дрэў.*
*Палеглі кедры ніцма*
*На дол імхоў нямы...*
*Прасека стромкай ніткаю*
*Нацягнута на пні.*

# УРАЛЬСКАЯ НОЧ

*Сонца коціцца ў кусты,*
*Завалюся ў стог мядзведзем,*
*Ноч разводзіць свае масты,*
*Каб ніхто яе тайну*
*не згледзеў.*
*Цяжкім бубнам*
*выбухвае стэп,*
*Табуны нясуцца віхурай.*
*Нават горкі палын,*
*як хлеб,*
*Пахне свежа,*
*нібы перад бурай.*
*Колка падае ў кавылі*
*Дождж — гарачыя зоры,*
*Быццам валаты-кавалі*
*Поўню вынялі з горна.*
*Спяць атары.*
*Дрэмле пастыр.*
*Стыне вогнішча*
*зліткам медным,*
*Не памогуць цяпер і масты,*
*Тваю тайну я ведаю.*

Уладзімір КАРПАЎ

# ЦАЛІНА-68

Целина—масштабов
величье,
Здесь за сорок мороз и
жара,
Здесь стираются грани
личного
В песне, сложенной
у костра.
И работа—не будем
спорить,—
У здоровых мокрые спины.
Здесь ребята, жаркие
в спорах,
Могут землю на градус
сдвинуть.
Могут сделать зимою лето,
Могут солнечный город
выстроить
На земле. И за землю эту,
Я уверен, сумеют
выстоять.
Мы из камня делаем
кружево.
Надо—небо настежь
раскроем.
Если нужно—то значит
нужно.
Строим—нужный стране
коровник.





